УДК 821.133.1:811.161.3'255.2

Рэпертуарныя мадэлі П. Верлена ў перакладах М. Багдановіча

Садко Л.М.
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск

У полісістэме айчыннай паэзіі к. XIX – п. XX ст. па аб'ектыўных прычынах складаецца сітуацыя высокай запатрабаванасці наватарскіх сродкаў мастацкай выразнасці, новых рэпертуарных мадэляў. Перакладныя творы М. Багдановіча, у прыватнасці пераклады-перастварэнні вершаў П. Верлена, валодаюць наборам агульных прыкмет і сеткай узаемасувязяў з сусветным прыгожым пісьменствам, распрацоўваюць наватарскія для беларускай літаратуры мастацкія рэпертуарныя мадэлі мадэрнісцкай лірыкі.

Мэта дадзенага даследавання – комплекснае вывучэнне рэпертуарных мадэляў у перакладах М. Багдановіча твораў П. Верлена і вызначэнне статусу гэтых перакладаў з пункту гледжання іх "першаснасці" і "другаснасці" ў полісістэме айчыннай паэзіі к. XIX – п. XX ст.

Матэрыял і метады. *Аб'ектам вывучэння выступаюць пераклады М. Багдановіча твораў П. Верлена (22 тэксты). Метадалагічная аснова даследавання – працы І. Эвен-Зохара, А. Кабаковіч, Г. Сініла, С. Велікоўскага, С. Баснет. Даследаванне грунтуецца на культурна-гістарычных прынцыпах, метадах полісістэмістыкі і кампаратывістыкі, прыёмах культуралагічнага перакладазнаўства.*

Вынікі і іх абмеркаванне. *У прымаючай культуры (у культуры мовы перакладу), згодна з полісістэмістыкай І. Эвен-Зохара, іншы раз складваюцца такія абставіны, калі транслаталогія становіцца важнай крыніцай інавацый у розных сацыякультурных сферах, а пераклады займаюць "першаснае" становішча ў нацыянальнай літаратуры. У дадзеным даследаванні выяўлены асноўныя верленаўскія рэпертуарныя мадэлі як крыніцы інавацый для беларускай паэзіі к. XIX – п. XX ст. і высветлены прыёмы і спосабы стварэння на іх аснове самабытнай сістэмы мастацкай выразнасці ў перакладах М. Багдановіча.*

Заключэнне. *Прыклад творчай перапрацоўкі рэпертурэм лірыкі П. Верлена, адаптацыя класічных мадэляў мадэрнісцкай паэзіі на глебе маладой беларускай літаратуры ў творчасці М. Багдановіча – сур'ёзныя і плённыя досведы, што гавораць пра асабліва важную ролю перыферыйнай (перакладной) літаратуры ў падтрыманні балансу нацыянальнай мастацкай сістэмы. Так, літаратурнае наватарства М. Багдановіча, віртуознае валоданне рэпертурэмамі-новаўвядзеннямі, запазычанымі з сусветнай паэзіі, дазваляюць гаварыць пра ізаморфнасць некалькіх літаратурных сістэм (французскай і беларускай), пра запатрабаванасць тых ці іншых мастацкіх рэпертуараў у пэўны перыяд.*

Ключавыя словы: *рэпертуарная мадэль, пераклад, нацыянальнае беларускае адраджэнне, М. Багдановіч, П. Верлен.*

(Ученые записки. – 2021. – Том 33. – С. 166–171)

P. Verlaine's Repertoire Models Translated by M. Bagdanovich

Sadko L.M.
Centre of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences, Minsk

In the polysystem of the national poetry of the XIXth – XXth centuries for objective reasons, there is a high demand for innovative means of artistic expression, new repertoire models. M. Bagdanovich's translated works, in particular the translations of P. Verlaine's poems, have a set of common features and a network of connections with the world's literature, develop innovative artistic repertoire models of modernist poetry for Belarusian literature.

The research purpose is a comprehensive study of the repertoire models in M. Bagdanovich's translations of P. Verlaine's works and identification of the status of these translations as "primary" and "secondary" in the polysystem of the national poetry of the XIXth – XXth centuries.

Material and methods. *The object of the study is translations of M. Bagdanovich's works by P. Verlaine (22 texts). The methodological basis of the research is the works of I. Even-Zohar, A. Kabakovich, G. Sinil, S. Velikovsky, S. Bassnett. The study is based on cultural and historical principles, methods of polysystematics and comparative studies, methods of cultural translation studies.*

Адрас для карэспандэнцыі: ***e-mail: konovod1@yandex.ru*** *– Л.М. Садко*

Findings and their discussion. *In the host culture (in the culture of the language of translation), according to the polysystemics of I. Even-Zohar, sometimes there are circumstances when translatology becomes an important source of innovation in various social and cultural spheres, and translations occupy a "primary" position in the national literature. This study reveals the main Verlaine repertoire models as the sources of innovation for Belarusian poetry of the XIXth – XXth centuries; methods and ways of creating on their basis an original system of artistic expression in M. Bagdanovich's translations are clarified.*

Conclusion. *An example of creative reworking of P. Verlaine's repertoire, adaptation of classical models of modernist poetry on the basis of young Belarusian literature in the works of M. Bagdanovich are serious and fruitful experiences that speak of a particularly important role of peripheral (translated) literature in maintaining the balance of the national art system. Thus, M. Bagdanovich's literary innovation, virtuoso mastery of repertoire-innovations borrowed from world poetry, allow us to speak about the isomorphism of several literary systems (French and Belarusian), about the demand for certain artistic repertoires in a certain period.*

Key words: *repertoire model, translation, national Belarusian revival, M. Bagdanovich, P. Verlaine.*

(Scientific notes. – 2021. – Vol. 33. – P. 166–171)

Як вядома, эвалюцыя любой сістэмы, у тым ліку і літаратурнай, з'яўляецца адзіным сродкам яе захавання. Асабліва востра гэтая ідэя актуалізавалася на хвалі беларускага нацыянальнага адраджэння к. XIX – п. XX ст., калі былі ўзнятыя балючыя пытанні будучыні роднай зямлі, лёсу беларускага народа, прагучалі заклікі да вызваленчага руху, развіцця самасвядомасці. Культурнае і грамадскае жыццё вельмі ажывілася праз спробы навучання на роднай мове, стварэнне народных бібліятэк, асветніцкіх таварыстваў, ініцыятыў кнігадрукавання на беларускай мове. Сур'ёзныя задачы стаялі перад маладымі літаратарамі, якія павінны былі адказаць на самыя надзённыя пытанні, распрацаваць самабытную сістэму сродкаў мастацкай выразнасці, паскорана асвоіць шэраг жанраў паэзіі, прозы і драматургіі. Цэлая плеяда маладых пісьменнікаў і публіцыстаў – Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, Цётка, С. Палуян, А. Гарун, М. Гарэцкі, Ядвігін Ш. і многія іншыя патрыёты беларускасці зрабілі магчымым развіццё нацыянальнай мовы, літаратуры і культуры.

Асаблівае месца ў руху нацыянальнага беларускага адраджэння, безумоўна, належыць М. Багдановічу, чыю ролю даследчык І. Багдановіч акрэслівае так: "Нібыта Боскім наканаваннем было прадвызначана М. Багдановічу нарадзіцца для гэтай зямлі, для гэтага народа і яго культуры" [1].

Неабходна адзначыць, што вузкі погляд на нацыянальнае быў чужым М. Багдановічу, які не толькі актыўна клапаціўся пра развіццё новай беларускай літаратуры, аднаўленне мовы, але і цікавіўся іншымі славянскімі і, наогул, сусветнымі дасягненнямі прыгожага пісьменства, шмат даследаваў творчасць украінскіх, рускіх, заходнееўрапейскіх майстроў слова, дакладна і прынцыпова вызначаючы моцныя і слабыя бакі айчыннай літаратуры ў параўнанні з класічнымі і мадэрновымі досведамі сусветнага мастацтва.

Выключны, паваротны момант у фарміраванні полісістэмы маладой беларускай літаратуры к. XIX – п. XX ст, немагчымасць адразу генерыраваць тэксты ўсіх жанраў і тыпаў падштурхоўваюць М. Багдановіча да пошукаў новых рэпертуарных мадэляў і перакладу вершаў майстроў замежнай паэзіі – П. Верлена, Э. Верхарна, Г. Гейнэ, Ф. Шылера, А. Пушкіна, старажытных твораў Авідзія, Гарацыя.

У такіх абставінах, на думку сучаснага культуролага і філолага І. Эвен-Зохара, тэарэтыка полісістэмнай тэорыі, перакладчыцкая дзейнасць займае першаснае становішча ў працэсе стварэння новых мадэляў, "галоўны клопат перакладчыка заключаецца не ў тым, каб шукаць ў сваіх хатніх запасах гатовыя мадэлі, згодна з якімі можна было б перавесці арыгінальныя тэксты; замест гэтага ён гатовы парушыць хатнія ўмовы" ("the translator's main concern is not to look for ready-made models in his home stock, into which the original texts could be transferable; instead he is prepared to violate the home conventions") [2, p. 26]. Полісістэміст у гэтай сувязі адзначае: "Сказаць, што перакладная літаратура захоўвае *першаснае* становішча, значыць сказаць, што яна актыўна ўдзельнічае ў *мадэляванні цэнтра* полісістэмы (вылучана І. Эвен-Зохарам. – *Л.С.*). У такой сітуацыі яна, па вялікім рахунку, з'яўляецца неад'емнай часткай наватарскіх сіл і як такая, верагодна, будзе атаясамляцца з буйнымі падзеямі ў гісторыі літаратуры" ("To say that translated literature maintains a *primary* position is to say that it participates actively in *modeling the center* of the polysystem. In such a situation it is by and large an integral part of innovatory forces, and as such likely to be identified with major events in literary history") [2, p. 23]. У артыкуле "Беларускае адраджэнне" М. Багдановіч якраз наконт наватарства ўласнай мастацкай стратэгіі адзначае, што "творчасць была накіравана галоўным чынам на пашырэнне кола тэм і формаў беларускай паэзіі" [3, с. 393]. Акрамя гэтага, М. Багдановіч уводзіць у полісістэму беларускай паэзіі асаблівага героя, не характэрнага для тагачаснай нацыянальнай літаратуры, – чуллівага, з вострым і тонкім адчуваннем законаў сусвету, гатовага да пастаяннай разумовай і эмацыйнай працы, добра адукаванага і выхаванага. Цэлы шэраг цікавых творчых знаходак еўрапейскіх майстроў слова М. Багдановіч уводзіць у мастацкі зварот беларускай паэзіі, пашыраючы магчымасці роднай мовы і прыгожага пісьменства,

дбаючы пра тое, каб пазбегнуць стэрэатыпізацыі літаратурнага рэпертуару і пераадолець "аднакалёрны слой" (выраз М. Багдановіча).

Зварот М. Багдановіча да перакладной працы твораў П. Верлена, зразумела, быў выкліканы цікавасцю беларускага паэта і тэарэтыка да распрацоўкі праблем культуралагічнага "злому", новага антрапацэнтрычнага падыходу, суб'ектывізацыі рэчаіснасці, яе пачуццёвага адлюстравання. Вядома, што свядомасць бясконца трансфармуе рэальнасць і ўвасабляе яе ў выглядзе ідэі, не праводзячы мяжы паміж матэрыяльным і эфемерным. Пошукі асаблівай эстэтычнай і паэтычнай выразнасці П. Верлена і эксперыменты М. Багдановіча, звязаныя з абнаўленнем сродкаў пісьма ў нацыянальнай літаратуры, пралягаюць у рэчышчы рэпертуарных мадэляў імпрэсіянізму. Сувязь паміж душой і прыродай, пераламленне рэальнасці праз прызму свядомасці суб'екта востра адчуваюцца ва ўласных творах абодвух гэтых аўтараў, робіць мастацкую манеру паэтаў роднаснай. Як адзначае А. Кабаковіч, "да вершаў П. Верлена ён звяртаўся з асаблівай ахвотай, бо знаходзіў у іх блізкія да асабістай эмацыянальную атмасферу і характар светаадчування" [4]. Г. Сініла таксама гаворыць аб асаблівай сувязі творчых установак гэтых мастакоў слова: "Паэтычнае наватарства слыннага французскага паэта, звязанае з прынцыпамі імпрэсіянізму і сімвалізму, аказваецца вельмі блізкім пошукам беларускага паэта (асабліва прынцыпы музычнасці і бясслоўнасці, сугестыўнасці, новая функцыя слова і асаблівая функцыя пейзажу, які пераўтвараецца ў «пейзаж душы»), што дазваляе яму вельмі тонка перавесці яго тэксты ў стыхію роднай мовы" [5, с. 152].

Мэта дадзенага даследавання – комплекснае вывучэнне рэпертуарных мадэляў у перакладах М. Багдановіча твораў П. Верлена і вызначэнне статусу гэтых перакладаў з пункту гледжання іх "першаснасці" і "другаснасці" ў полісістэме айчыннай паэзіі к. XIX – п. XX ст.

Матэрыял і метады. М. Багдановіч узяўся за пераклад 22-х твораў П. Верлена з шасці яго самых знакамітых зборнікаў: "Сатурнічныя паэмы", 1866 ("Poèmes saturniens"); "Галантныя святы", 1869 ("Fêtes galantes"); "Добрая песня", 1870 ("La Bonne chanson"); "Рамансы без слоў" 1874 ("Romances sans paroles"); "Мудрасць", 1881 ("Sagesse"); "Даўно і нядаўна", 1885 ("Jadis et Naguère"). Да вершаў са зборнікаў П. Верлена пасля 1885 года беларускі паэт і перакладчык не звяртаецца.

Даследаванне грунтуецца на культурна-гістарычных прынцыпах, метадах полісістэмістыкі і кампаратывістыкі, прыёмах культуралагічнага перакладазнаўства.

Вынікі і іх абмеркаванне. Слынныя пейзажы душы, увасобленыя П. Верленам у вершах яго першага зборніка "Сатурнічныя паэмы", з асаблівым поспехам перакладзены М. Багдановічам. Вядомая ганкураўская дэкларацыя "бачыць, адчуваць, адлюстроўваць", якая стала хаслам імпрэсіянізму, знайшла ўвасабленне ў верленаўскім цыкле з характэрнай назвай "Сумныя пейзажы" ("Paysages tristes"). У вершах "Асенняя песня" ("Chanson d'automne") і "Захад" ("Soleils couchants") у перакладзе М. Багдановіча заяўлены характэрны паралелізм і ўзаемападабенства знешняга і ўнутранага, душа чалавека малюецца як адна з прыродных стыхій. Зразумела, што акрамя гэтай наватарскай канцэпцыі адпаведнасцей (correspondances) аб адзінстве свету і шчыльнай узаемасувязі ўсіх яго элементаў, што Ш. Бадлер дэкларуе так: «Весь видимый мир есть вместилище образов и знаков, относительная ценность и место которых в искусстве должно определяться воображением» [6, с. 196–197], беларускі перакладчык сутыкнуўся з сур'ёзнай задачай перадаць вядомую спеўнасць верленаўскіх радкоў, распрацаваць уласнабеларускую сістэму гукапісу. Небеспадстаўна ўжо першы рэцэнзент твораў М. Багдановіча А. Луцкевіч адзначае: "Чытаць вершы Багдановіча павінны толькі тыя, хто разумее музыку слова, чыя душа бачыць хараство ў чыстай паэзіі" [7, с. 14].

Абодва пераклады меланхалічныя, абодва пра згасанне, пра восеньскую скруху і слабы золак, захад сонца, пра холад жыцця і безнадзейнасць у душы. Але асаблівая эстэтызацыя рэчаіснасці, што прывабіла майстра хараства і красы М. Багдановіча ў верленаўскіх тэкстах, перададзена бліскуча. Настраёвы малюнак жыццёвага змяркання ў вершы "Захад" увасоблены ў плаўнай інтанацыі жаночай рыфмы, у выкарыстанні працяжных галосных "а", "о". Падобны гукапіс назіраецца і ў вершы-арыгінале:

Слабне золак, згарае –
І нячутна, паволі
Смутак свой разлівае
Захад сонца ў полі [3, с. 172].

Une aube affaiblie
Verse par les champs
La mélancolie
Des soleils couchants [8, p. 26]

Зусім іншыя сродкі гукапісу ўводзіць М. Багдановіч у пераклад "Асенняй песні", верша-візітоўкі П. Верлена і наогул сусветнай музычнай паэзіі. Беларускі перакладчык трапна выкарыстоўвае інструментоўку выбуховымі зычнымі "д", "б", санорнымі "р", "н", што не спяваюцца, ствараюць неабходную атмасферу гаротнай безвыходнасці, безабароннасці. Кароткія ў арыгінале радкі ў Багдановічавым перакладзе-перастварэнні гучаць адрывіста, як быццам у прамоўцы, скаванага холадам, не хапае сіл на доўгія размовы, душа сцінаецца перад вялікай неспасціжнасцю існавання. М. Багдановічу на ўзроўні інтанацыі ўдалося перадаць ідэю паўзы, змястоўнага маўчання як эквіваленту патаемнага іншабыцця. Радкі пера-

кладу верша “Асенняя песня” палохаюць, навяваюць настрой трагічнай наканаванасці, жальбы, а чалавечы лёс падобны на сухі ліст, што ляціць у віхуры:

Як раньш, пяе
І ў сэрца б’е
Сумны тон.
То, восень, іх,
Бальных тваіх
Скрыпак, стогн.
Чу! Часу ўдар!
Бляднее твар,
Рвецца ўздых:
Ўстаў карагод
Мінулых год,
Дзён былых [3, с. 171].

Les sanglots longs
Des violons
De l’automne
Blessent mon cœur
D’une langueur
Monotone.
Tout suffocant
Et blême, quand
Sonne l’heure,
Je me souviens
Des jours anciens
Et je pleure [8, p. 26].

Найбольшая колькасць – шэсць тэкстаў – гэта пераклады верленаўскіх вершаў са зборніка “Рамансы без слоў”. Безумоўна, у арыгінальнай назве дэкларуюцца прынцыпы сугестыі, спасціжэння сэнсу не праз рацыянальныя намаганні, а праз інтэнсіўную працу ўяўлення і пачуццяў чытача. Сапраўдная паэзія, на думку тэарэтыкаў і практыкаў-мадэрністаў, павінна даваць намёкі, гіпнатызаваць гучаннем, наводзіць на развагі, а словы і гукі паэтычнага тэксту могуць прыраўноўвацца да музычных адзінак, што будзяць душу слухача непасрэдна, без разумовых аперацый. Знаўца французскай літаратуры С. Велікоўскі адзначае: «К Верлену чаще всего не приложимы слова: живописует, высказывается. Он скорее навевает какое-то настроение-впечатление при помощи размытого намекающего мазка» [9, с. 85]. Аднак верленісты лічаць, што ў гэтым зборніку эстэтычныя і паэтычныя дамінанты “цьмянай” паэзіі, дэкадансу паволі саступаюць дарогу сапраўднай псіхалагічнасці, што не магло не імпанаваць М. Багдановічу, чый мастацкі метад адрозніваецца жыццясвярджальнасцю, маральнай трываласцю, глыбінёй спасціжэння ўнутранага свету чалавека.

П. Верлен першы цыкл свайго зборніка называе хутчэй як кампазітар, чым паэт: “Забытыя арыеты” (“Ariettes oubliées”), звязваючы ў гарманічнае адзінства сродкі музыкі і мастацкага слова. Музычны жанр арыеты – простай і меладычнай невялічкай арыі з песенным гучаннем – дазваляе шчыра распавесці пра настрой самотнага паэта, рэчыўны свет, выяўляючы праз прызму душэўнага стану. Цікава, што вершы з іншых цыклаў зборніка “Рамансы без слоў” – “Бельгійскія пейзажы” і “Акварэлі”, больш дакладныя і рэалістычныя, з дэталёвым адлюстраваннем жыцця вялікага горада, прамысловых раёнаў, чыгункі, вакзалаў і г.д. – не прывабілі беларускага паэта і перакладчыка. Відавочна, што падобныя рэпертурэмы былі далёкімі ад патрэб беларускага грамадства і літаратуры к. XIX ст.

У вершах цыкла “Забытыя арыеты” П. Верлен распрацоўвае некалькі рэпертуарных мадэляў: прынцыпова рэалістычны пейзаж выконвае ў творах паэта псіхалагічную функцыю адлюстравання самотнай душы лірычнага героя і яго эмацыйнага стану, а таксама распаўсюджанне атрымліваюць малюнкі трагічнай адзіноты, холаду, плачу, нуды, прыцемак.

Беларускі аўтар не засяроджвае ўвагі на пейзажных рэпертурэмах, досыць распрацаваных у айчынным прыгожым пісьменстве, больш прываблівае перакладчыка магчымасці псіхалагічнага метаду П. Верлена, распрацоўка характару ўражлівага рэфлексуючага героя-сузіральніка, што пакутуе ў сумненнях, змрочных адчуваннях. У вершах няпэўныя вобразы прыроды і вібрацыі душы ўзаемна адлюстроўваюцца адзін у адным, дыстанцыя паміж вонкавым і ўнутраным раствараецца і знікае. Паказальнымі робяцца нават назвы перакладзеных М. Багдановічам вершаў, дзе паўтараюцца такія паказальныя лексемы, як “мана”, “мрок”, “плач”, “сум”.

Найбольш вядомы пераклад М. Багдановіча – гэта адмысловы верш “Раяль цалуе тонкая рука…” (“Le piano que baise une main frêle...”), які па лексічным складзе досыць блізкі да арыгіналу, удала перадае метафорыку і метрыку. Тэкст будуецца вакол сінэстэзіі гуку, колеру, паху, кінэстэтычных адчуванняў, асацыятыўна цесна звязаных з душэўным станам героя, што засяроджаны на сваіх думках і пачуццях. У вершы створана замалёўка з натуры, выява імгнення быцця, калі выпадковая мелодыя, фарбы сонца на захадзе, лёгкі пах будзяць у душы цэлы шэраг пачуццяў і нявызначаных вобразаў, што адгукаюцца і пераклікаюцца між сабой:

Раяль цалуе тонкая рука
У час вячэрні, шэра-ружаваты;
І на крылах, цішэй ад вецярка,
Ў паветры мяккім, пекным паплыла ты
Пужліва, песня, і срэдзь комнат хаты
Шчэ доўга веяў пах, як ад цвятка [3, с. 174].

Le piano que baise une main frùle
Luit dans le soir rose et gris vaguement,
Tandis qu'avec un très léger bruit d'aile
Un air bien vieux, bien faible et bien charmant,
Rôde discret, épeuré quasiment,
Par le boudoir longtemps parfumé d’Elle [8, p. 158].

Відавочна, што ў творы задзейнічаны выяўленчыя сродкі розных відаў мастацтва, пяройдзена мяжа канкрэтнага месца і часу, лірычны герой падарожнічае ў недасягальную краіну мрояў і хараства.

Трэба адзначыць, што ў творчасці П. Верлена бяздольны і адрынуты лірычны герой нават не марыць адшукаць блізкую душу, тады як М. Багдановіч спыняецца на перакладзе нешматлікіх тэкстаў, дзе гучаць жыццесвярджальныя думкі, аднаўляючы ў сістэме беларускай літаратуры больш звыклы комплекс адносін да чалавека і свету. Так, у перакладзе "Трэ нам, бачыш, усё між сабой дараваць" ("Il faut, voyez-vous, nous pardonner les choses...") знаходзяць адлюстраванне хрысціянскія тэмы выгнання, пакорлівасці, дзіцячай лагоднасці, цяжкасці жыцця знаходзяць супакаенне ў дараванні грахоў. І калі ў верленаўскіх пачатковых радках гучыць больш нарцысічны, персаналізаваны выраз пра дараванне канкрэтнай асобе, то беларускі перакладчык высакародна гаворыць пра ўзаемнае, сапраўднае дараванне, жыццё, дзе радасці і гора дзеляцца пароўну:

Трэ нам, бачыш, усё між сабой дараваць, –
Так хоць шчасце нарэшце спаткае абох,
А і прыдзецца гора ў жыцці нам зазнаць,
Дык прынамсі... ці ж не?.. будзем плакаць
удвох [3, с. 169].

Il faut, voyez-vous, nous pardonner les choses.
De celte façon nous serons bien heureuses,
Et si notre vie a des instants moroses,
Du moins nous serons, n'est ce pas? deux
pleureuses [8, p. 158].

З больш позняй творчасці П. Верлена М. Багдановіч вылучыў верш "Млоснасць" ("Langueur") са зборніка "Даўно і нядаўна". Гэты тэкст па некалькіх прычынах мог выклікаць транслаталагічную цікавасць. Па-першае, М. Багдановіч у гэтым знакамітым санеце заўважыў дасканалае ўвасабленне традыцый дадзенай жанравай формы, магчымасць выкарыстаць замежныя літаратурныя рэпертурэмы, патэнцыял "чужаземнага паэтычнага труда". Паэт адзначае, што "ні адзін санет з цэлай расійскай пісьменнасці не вытрымлівае ўсіх тых правіл, якія спаўняліся мной, павэдлуг вымог тэарэтыкаў гэтай формы" [3, с. 535–536]. Па-другое, сацыяльна-культурныя абставіны вірлівага жыцця Францыі другой паловы XIX ст. апасродкавана знайшлі ўвасабленне ў верленаўскім вершы ў вобразах заняпаду Рымскай імперыі, "канца свету", стомленасці. Французскі паэт паказвае, якія балючыя сляды пакідаюць палітычныя і сацыяльныя ўзрушэнні ў душы лірычнага героя, што шкадуе аб страчаных магчымасцях, аб пустым жыцці. Беларускае грамадства к. XIX – п. XX стст., як вядома, перажывала цэлы комплекс асаблівых падзей, звязаных з пераходнасцю перыяду, адраджэнскім пафасам і пошукамі ўласных эстэтычных і паэтычных дарог. Ведаючы жыццёвую і грамадскую пазіцыю М. Багдановіча, дэкадэнцкі еўрапейскі верш гучыць у беларускім перакладзе як дакладная псіхалагічная характарыстыка, сацыяльнае абвінавачванне супраць заняпаду святынь, як думкі аб марных тратах душэўных сіл:

У самотным сэрцы – зло, у душы – нуда густая.
І бітвы чуючы, каторых шум не сціх,
Не можа, кволы, ён дайсці жадань сваіх,
Не хоча рушыцца, жыцця не аздабляе!
[3, с. 180]

L'àme seuletle a mal au cœur d'un ennui dense,
Là-bas on dit qu'il est de longs combats sanglants.
O n'y pouvoir, étant si faible aux vœux si lents,
O n'y vouloir fleurir un peu celte existence!
[8, p. 158].

Заключэнне. Праца над перакладамі з еўрапейскай паэзіі дала магчымасць М. Багдановічу распрацаваць самабытную мастацкую мадэль, спецыфічныя вобразы і матывы, развіць новыя для беларускага айчыннага прыгожага пісьменства рэпертуарныя адзінкі і мадэлі.

Перыяд нацыянальнага Адраджэння ў беларускім грамадстве к. XIX – п. XX ст ст., узмацненне актыўных пошукаў новых літаратурных і культурных прыёмаў і сродкаў у сферы эстэтыкі і паэтыкі зрабілі магчымым зварот да еўрапейскай паэзіі на розных мовах як да крыніцы інавацый, каб забяспечыць патрэбы нацыянальнай літаратуры. Неабходна падкрэсліць, што перакладчыцкія досведы М. Багдановіча і яго паслядоўнікаў не маюць рыс прымусовай замены тых ці іншых рэпертуарных мадэляў у беларускай літаратурнай полісістэме, яна не становіцца падначаленай больш дамінантным сусветным культурам. Падобная дзейнасць М. Багдановіча па перакладзе твораў П. Верлена, іншых майстроў слова не стала простым міжмоўным перакадаваннем, яна заснаваная "на равенстве партнёров" [10, с. 38]. Рэпертуарныя мадэлі французскага паэта-мадэрніста П. Верлена, скрозь прасякнутыя музычнай стыхіяй, роздумныя, меланхалічныя, з'яўляюцца гарманічным сінтэзам мастацтва слова, музыкі і жывапісу, што не магло не зацікавіць М. Багдановіча, спеўнасць і мілагучнасць твораў якога сталі ўзорнымі ў беларускай паэзіі.

Літаратура

1. Багдановіч, І. Пакліканы Адраджэннем / І. Багдановіч // Сайт Максима Богдановича [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.maksimbogdanovich.ru/articles/29.htm. – Дата доступу: 11.10.2020.
2. Even-Zohar, I. The Position of Translated Literature within the Literary Polysystem / I. Even-Zohar // Papers in Historical Poetics. – Tel Aviv : Porter Institute, 1978. – P. 21–28.

3. Багдановіч, М. Творы / Максім Багдановіч; уклад. і камент. Ю.В. Пацюпы; навук. рэд. А.С. Ліс. – Мінск: Маст. літ., 2014. – 670 с.
4. Кабаковіч, А. Паэзія Максіма Багдановіча : Дыялектыка рацыянальнага і эмацыянальнага / А. Кабаковіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 136 с. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.maksimbogdanovich.ru/articles/5-page-28.htm. – Дата доступу: 13.02.2021.
5. Сініла, Г.В. Паэзія М. Багдановіча ў кантэксце эпохі дэкадансу і мадэрну / Г.В. Сініла // Кніга новага жыцця: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 26 лістап. 2013 г., [прысвеч. 100-годдзю адзінага прыжыццёвага зб. вершаў М. Багдановіча "Вянок"] / Літ. музей М. Багдановіча; [уклад.: М.М. Запартыка, І.У. Шорац]. – Мінск: РІВШ, 2014. – С. 152–157.
6. Шарль Бодлер об искусстве; пер. Н.И. Столяровой и Л.Д. Липман; ред. Ю.Н. Стефанов. – М.: Искусство, 1986. – 422 с.
7. Максім Багдановіч: вядомы і невядомы: зб. літаратуразн. і арх. матэрыялаў / уклад. і камент. Ц.В. Чарнякевіча; прадм. і гласарый Ю.В. Пацюпы. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011. – 392 с.
8. Verlaine, P. Œuvres completes: En 5 volumes. – Paris: Paris Librairie Léon Vaniër, éditeur, 1906. – Tome premier: Poèmes saturniens. Fetes galantes. Bonne chanson. Romances sans paroles. Sagesse. Jadis et naguère. – 455 p.
9. Великовский, С.И. В скрещенье лучей: групповой портрет с Полем Элюаром / С.И. Великовский. – М.: Совет. писатель, 1987. – 400 с.
10. Басснетт, С. Истоки и развитие переводоведения в 1975–2016 гг. / С. Басснетт // Вестн. С.-Петер. ун-та. Язык и литература. – 2016. – Вып. 4. – С. 31–43.

Паступіў у рэдакцыю 30.03.2021